**Ад класікаў да творчай моладзі: што прапануе чытачам выдавецтва “Мастацкай літаратуры”**

«Чытаць усё зусім не трэба. Чытаць трэба толькі тое, што адказвае на пытанні, якія ўзнікаюць у душы,” — справядліва лічыў Леў Талстой. Таму ў чытача заўсёды павінен быць выбар: адны шукаюць адказы на гэтыя пытанні ў класікаў, іншыя — у творах сваіх равеснікаў, маладых аўтараў. Нехта любіць паэзію, а нехта аддае перавагу прыгодніцкай літаратуры. Паспрабуем з’арыентаваць розныя катэгорыі чытачоў некалькімі навінкамі выдавецтва “Мастацкая літаратура”.




26 лістапада споўнілася 95 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча. Хто з нас яшчэ ў падлеткавым узросце не чытаў яго “Дзікае паляванне караля Стаха” ці “Чорны замак Альшанскі”! Але першы зборнік знакамітага аўтара, які называўся “Матчына душа” (1958), склала не проза, а паэзія. Яшчэ да выхаду гэтай кнігі Караткевіч быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі, што ўвогуле з’яўляецца вельмі рэдкай з’явай у айчынным прыгожым пісьменстве. На яго вершы тут жа звярнула ўвагу крытыка, яны прыцягвалі ўвагу сваёй самабытнасцю і выклікалі спрэчкі. А сёння гэта несумненная класіка, у чым нас лішні раз пераконвае зборнік “Кастальская крыніца”, які выйшаў у серыі “Новая бібліятэка беларускай паэзіі”.




А вось адна з апошніх кніг серыі “Бібліятэка беларускай аповесці” спрабуе адказаць на пытанне, што такое сучасная айчынная прыгодніцкая літаратура. Імёны аўтара, чые творы трапілі ў зборнік, на слыху, і кожны з іх ужо далёка не першы год працуе ў гэтым жанры: хто піша фантастыку, хто дэтэктывы, а хто і гістарычную вострапсіхалагічную прозу. Цікава, што ўсе яны стала жывуць на пэўнай аддаленасці ад тлумнай сталіцы: Генадзя Аўласенку натхняе Чэрвень, Сяргея Белаяра Брэст, а Уладзіміра Мажылоўскага Браслаўшчына. Тры аўтары пад адной вокладкай — чым не добрая нагода адказаць тым скептыкам, якія лічаць: сучасная прыгодніцкая літаратура — гэта не пра нас.

Ёсць чытачы, якія любяць узяць у рукі кнігу новага, маладога аўтара. Яно і не дзіўна: ад аўтара, якога не раз чытаў, ужо прыкладна ведаеш, чаго чакаць далей. Знаёмства з творам невядомага табе пісьменніка — заўсёды шлях у невядомасць, і ты нязменна спадзяешся, што гэты шлях будзе цікавы. Такім чытачам раім пазнаёміцца з дэбютнай кнігай Вікторыі Кляўко — раманам “Вырай”. Вікторыя скончыла Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт па спецыяльнасці выкладчык англійскай і французскай моў і літаратуры, а таксама Літаратурны інстытут імя Горкага (курсы пісьменніцкага майстэрства). Летась “Вырай” стаў фіналістам рэспубліканскага конкурсу LitUp, арганізаванага Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Трэба сказаць, што не кожны малады аўтар рашаецца дэбютаваць адразу раманам, — як правіла, патрэбен значны і жыццёвы, і творчы вопыт. Зрэшты, як прызнаваўся той жа Караткевіч, адказваючы на пытанне “Як нараджаюцца задумы новых твораў”: “Гэта можа быць кімсьці сказанае слова, цікавая ідэя,

пейзаж. Нават пах. Я асабіста лічу, што “Антонаўскія яблыкі” Бунін мог напісаць толькі пад уражаннем водару антонавак у скрынцы яго пісьмовага стала. Гэты пах выклікаў няяснае адчуванне, успамін. З усяго гэтага разам узятага нарадзілася апавяданне”. Дык што, усё проста? Не, вельмі складана!

